Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаунага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 12 (254) | Субота, 7 красавіка 1956 года. | Цана 20 кап.

## Першакурснікі ў лабараторыях

Ярка залітая вясеннім сонцам вялікая лабараторыя біякорпуса. Сёння сюды прышлі займацца студэнты першага курса аддзялення геаграфіі. На сценах акуратна развешаны шматлікія схемы, чарцяжы, малюнкі, манаграмы, дыяграмы, на кожным сталу—два бліскучыя мікраскопы, у блюдцах ляжаць гатовыя прэпараты— усё гатова для правядзення заняткау па батаніцы раслін.

Першакурсніца Тамара Пархімовіч, заглянуушы у мікраскоп, ад здзіулення ускрыкнула:

— Ох, як цікава!

Сапрауды, кропля вады, якая здавалася мёртвай, раптам ажыла. Дзесяткі мізэрна маленькіх істот насіліся у розных напрамках, сутыкаліся, тоупіліся. Доуга назірала яна за жыццём у гэтай балотнай кроплі. Побач—сшытак, куды яна старанна запісвае усе свае назіранні.

Услед за кропляй вады Тамара разглядае узоры прасцейшых водарасцей. Тэма здавалася сухой і нецікавай. Але лабараторная работа паказала, што гэта не так. Водарасці—гэта нібыта звязваючае звяно паміж раслінным і жывёльным светам. Але дзе-ж гэта грань? І тут студэнтка прыпамінае усё, што яна чула на лекцыях. Аказваецца, што пры лабараторных занятках немагчыма абыйсціся без «сухога» матэрыялу лекцый.

Побач з Тамарай, схіліушыся над мікраскопам, працуе Люда Дамашэвіч. Твар яе расчырванеуся, вочы блішчаць. Назіранні захапілі яе поунасцю. А нядауна-ж Людміла была зусім іншай думкі аб лабараторных занятках. Навошта яны патрэбны? Ці-ж недастаткова таго, што даводзіцца вывучаць па «Батаніцы раслін»? Так, недастаткова. Люда напамяць скажа назвы складаных частак раслін, уласцівасці іх, але-ж усё-такі уяуленні аб іх былі вельмі цьмяныя, да таго-ж усё гэта хутка забывалася. А цяпер наглядна бачны усе тыя змены, якія адбываюцца з тканінай раслін пад уплывам перамены тэмпературы. Пасля таго, як убачыш усё гэта сваімі вачыма, матэрыял падручніка прадстае ужо зусім у іншым выглядзе. На доугія гады застануцца веды пасля праведзеных лабараторных работ.

Да Ліды Еутух падыходзіць кіраунік заняткау. Валянціна Канстанцінауна Гаравец. Некаторы час яна стаіць каля дзяучыны моучкі, а калі зауважае, што тая пачынае хмурыцца і нервавацца, рыуком круцячы крэмальеру тубуса, нахіляецца дапамагчы правільна накіраваць аб'ектыу на разглядаемую рэч.

— Ты-ж да святла павярні аб'ектыу, ды апусці яго ніжэй, і не хвалюйся...

Валянціна Канстанцінауна робіць некалькі упэуненых рухау— на люстэрку ясна выступаюць тыя істоты, якія так старанна шукала студэнтка. Кіраунік дае ёй яшчэ некалькі парад і накіроувaецца праверыць работу выдатніцы курса Галіны Шкор.

Чатыры гадзіны падрад ідуць лабараторныя заняткі, але час праходзіць вельмі хутка. Нават не хочацца пакідаць лабараторыю. Дзяучаты нават шкадуюць, што прыдзецца вярнуцца сюды толькі праз тыдзень. Але раней, чым пакінуць лабараторыю, яны прыводзяць у парадак сталы, наглядныя дапаможнікі, падмятаюць падлогу.

Потым усёй групай выходзяць у калідор. Але з заканчэннем заняткау не канчаюцца дэбаты сярод студэнтаў Яны спрачаюцца паміж сабой аб праведзеных доследах, аб сваёй спецыяльнасці географа, аб карысці такіх лабараторных работ у сваёй будучай дзейнасці.

Вось так, спрачаючыся, жартуючы і смеючыся, уся група пакідае універсітэт, і кожны з іх упауне задаволен сваёй работай за дзень.

**А. УХАНАЎ.**



*НА ЗДЫМКУ: Валянціна Канстанцінауна Гаравец вядзе лабараторныя заняткі па батаніцы раслін.*

## АРТЫСТЫ У ГАСЦЯХ У СТУДЭНТАЎ

У актавай зале юрыдычнага факультэта студэнты юрыдычнага і гістарычнага факультэтау сустрэліся з артыстамі Беларускага дзяржаунага ордэна Леніна тэатра оперы і балета.

На гэтым вечары артыстка тэатра Шалкавец выканала «Іспанскі танец» з балета «Лебядзінае возера», рускую народную песню «Зачем тебя я, милый мой, узнала», песні «Дзве ластаукі» і «Майскі вальс».

Цёпла сустрэлі прысутныя заслужаную артыстку БССР Тамару Шымко. Яна выканала «Заздраўную» Дунаеускага і «Я за рэчаньку гляджу» Макраусава. Арыю Мельніка з оперы Даргамыжскага «Русалка» выканау заслужаны артыст БССР Леанід Бражнік. Перад гледачамі выступілі таксама заслужаныя артысты БССР Мартынау і Барадзіна.

Студэнты засталіся задаволенымі сустрэчай.

**І. СЯРГЕЕЎ.**

## НАШ ВУЧОНЫ

Грамадскасць нашага універсітэта адзначае пяцідзесяцігоддзе прафесара Івана Васільевіча Гутарава, аднаго са старэйшых вучоных БДУ імя В. І. Леніна.



Іван Васільевіч прайшоу шлях, тыповы для вучоных савецкай школы, выкліканых да творчай дзейнасці соцыялістычнай рэчаіснасцю, выхаваных Комуністычнай партыяй.

Іван Васільевіч нарадзіуся у 1906 годзе, у вёсцы Волкаука, што на Магілёушчыне. Яго бацькі сяляне, памёрлі яшчэ да Кастрычніцкай рэволюцыі. Будучаму вучонаму прышлося выхоувацца у савецкіх дзіцячых установах. Сярэднюю адукацыю ён атрымау у Леменскай вопытна - паказальнай школе-комуне імя В. І. Леніна. У 1928 годзе Іван Васільевіч закончыу Беларускі дзяржауны універсітэт, а у 1939 годзе аспірантуру пры Маскоускім інстытуце філасофіі, літаратуры, гісторыі (МІФЛІ). У 1939 г. І. В. Гутаравым была абаронена кандыдацкая дысертацыя на тэму «Паэтычнае майстэрства В. В. Маякоускага.

Пачынаючы з гэтага часу, Іван Васільевіч нязменна працуе у нашым універсітэце. Ён бядзе выхавауччую, грамадскую, навуковую работу. У пасляваенныя гады І. В. Гутарау першым з нашых літаратуразнаучау абараніу доктарскую дысертацыю на тэму аб творчасці народа у перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

Прафесар І. В. Гутарау працуе у галіне эстэтыкі, фальклырыстыкі, літаратуразнаўства. Ім напісана 3 кнігі, 5 брашур, 89 артыкулау.

Сваё пяцідзесяцігоддзе Іван Васільевіч сустракае у поуным росквіце сіл.У яго яшчэ вельмі многа неажыццяулёных творчых планау. Пажадаем-жа нашаму паважанаму вучонаму далейшых вялікіх поспехау у высакароднай справе развіцця савецкай навукі, выхавання новых маладых кадрау культуры.

### ГЛЫБОКАПАВАЖАНЫ ІВАН ВАСІЛЬЕВІЧ

*Рэктарат, партыйны камітэт Беларускага дзяржаунага універсітэта імя В. І. Леніна ад імя усяго калектыву навуковых работнікау, аспірантау і студэнтау шчыра віншуюць Вас з пяцідзесяцігоддзем з дня Вашага нараджэння і жадаюць Вам многіх год жыцця, здароўя і плённай работы на карысць нашай Радзімы. На працягу многіх год работы ў нашым універсітэце Вы, Іван Васільевіч, удзялялі і ўдзяляеце вялікую увагу справе падрыхтоукі высокакваліфікаваных спецыялістау-філолагаў.*

*Побач з педагагічнай работай Вы паспяхова займаецеся вывучэннем і даследаваннем творчых праблем савецкага літаратуразнаўства.*

*Сардэчна жадаем Вам, Іван Васільевіч, новых поспехаў у справе служэння нашай вялікай соцыялістычнай Радзіме, якая ўпэунена ідзе да комунізма пад выпрабаваным кіраўніцтвам Комуністычнай партыі Савецкага Саюза.*

**РЭКТАРАТ, ПАРТКОМ, МЯСЦКОМ.**

## АБМЕРКАВАННЕ НОВАГА КІНОФІЛЬМА

Студэнты аддзялення журналістыкі сустрэліся са стваральнікамі выпушчанага кінастудыяй «Беларусьфільм» кінофільма «Зялёныя агні».

У час абмеркавання студэнты Мохарт, Харкевіч, Манцэвіч. Іванова і іншыя гаварылі, што гэты кінофільм удалы, нягледзячы на рад недахопау. Яны указалі, што вобраз Дусі не адыгрывае патрэбнай ролі, што у фільме вельмі многа паравозау. Не пераканаучы вобраз і начальніка аддзялення чыгункі.

Стваральнікі гэтага фільма рэжысёр т. Шульман, кампазітар Бельзацкі, артысты Карнавухау, Трушына, Аладунко расказалі аб сваёй рабоце над фільмам, а таксама падзякавалі студэнтау за зробленыя заувагі.

**Я. ГОМАН.**

## ПАСЯДЖЭННЕ АРГАНІЗАЦЫІ ДТСААФ

Днямі адбылося пасяджэнне членау арганізацыі ДТСААФ універсітэта. На ім выступіу тав. Кірсанау, які расказау аб выніках работы арганізацыі за апошні час. Ён адзначыу, што добрых вынікау дасягнула арганізацыя у рабоце стралковага і парашутнага гурткоу. Падрыхтавана многа стралкоу-разраднікау. Дакладчык адзначыу, што дрэнна пастаулена работа на філалагічным факультэце.

Выступіла студэнтка-першаразрадніца Т. Сарока, вопытам сваёй работы падзяліуся старшыня арганізацыі геолага-геаграфічнага факультэта Скарынка і іншыя.

**В. БОЛДЫШАЎ.**

## Падрыхтоўка да агульнагарадскога агляду студэнцкіх работ

Ва усіх навуковых студэнцкіх гуртках універсітэта пачалася падрыхтоука да прадстаулення на агульнагарадскі агляд лепшых студэнцкіх навуковых дакладау і даследчых прац. Гуртковцы заслухоуваюць даклады, абмяркоуваюць іх на пасяджэннях, выпрауляюць дапушчаныя памылкі.

Добра рыхтуецца да агляду гурток беларускай літаратуры філалагічнага факультэта. Тут да агляду падабрана ужо 6 добрых работ. Нядауна гуртковцы заслухалі і абмеркавалі новы даклад студэнта II курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры Рыгора Барадуліна «Дарэволюцыйныя гумарыстычныя апавяданні Якуба Коласа». На абмеркаванні выступілі кіраунік гуртка І. Я. Науменка, стараста А. Клышко і іншыя гуртковцы, якія адзначылі, што даклад у цэлым атрымауся добры і заслугоувае увагі. Яны адзначылі і рад недахопау, якія трэба выправіць. Гэты даклад таксама будзе прадстаулены на агляд. У хуткім часе гуртковцы абмяркуюць яшчэ некалькі дакладау.

Падрыхтоуку да агляду вядзе і гурток зарубежнай літаратуры (кіраунік Д. Е. Фактаровіч). Днямі тут праслухан і абмеркаваны вельмі цікавы даклад студэнткі С. Казловай «Г. Гейне і сучаснасць». На гуртку падабрана да агляду больш 5 студэнцкіх работ.

**Б. ЧОРНЫ.**

## У кабінеце гісторыі СССР

Утульнасць, чыстата —вось што адразу кідаецца у вочы, калі увойдзеш у кабінет гісторыі СССР. У кабінеце дэманструюцца на вузкаплёначным гукавым апараце фільмы, якія спецыяльна выпісваюцца. Напрыклад, дацэнт М. Б. Фрыдман прачытала лекцыю аб дзекабрыстах. У той-жа дзень для нагляднага і больш глыбокага уразумення быу прадэманстраван фільм аб дзекабрыстах.

Студэнты паглядзелі фільмы аб Ленінградскім Эрмітажы, аб раскопках старыннага горада, асобныя эпізоды Айчыннай вайны 1812 года.

**Ф. САВІЦКІ, Н. ЧАЙКА.**

## Сустрэча з народным пісьменнікам

Ва універсітэце адбылася сустрэча студэнтау з народным пісьменнікам БССР Кандратам Крапівой. З уступным словам выступіу дэкан філалагічнага факультэта М. Ларчанка. Аб жыццёвым і творчым шляху пісьменніка расказау ст. выкладчык В. Карабан.

З віншаваннем юбіляра выступілі студэнты. Ан. Клышко, студэнт 3-га курса аддз. беларускай мовы і літаратуры, адзначыу незабыўнае уражанне, якое пакідаюць сатырычныя творы К. Крапівы. Некалькі баек пісьменніка прачытау студэнт 2-га курса аддз. бел. мовы і літаратуры Барадулін. Юбіляру прысвяціу свой віншавальны верш Ніл Гілевіч.

У заключэнне пісьменнік К. Крапіва расказау аб сваёй літаратурнай і навуковай працы, аб сваіх творчых планах на будучае. Ён прачытау свой сатырычны вершаваны фельетон «Лясная казка» і некалькі баек.

**П. КАЗАЧОНАК.**

## БЫВАЕ...

*...што стараста чацвертай групы першага курса аддзялення фізікі Хітрова не адзначае ў журнале наведвання пропускі лекцый студэнтамі. Па месяцу яна не бярэ гэты журнал нават у рукі. У канцы сакавіка не стаяла ў журнале ніводнай адзнакі.*

*...што у студэнткі III курса хімічнага факультэта Ніны Кулажанка нехапае часу, каб дыхнуць нават. Так вось было у яе, калі група даручыла ёй зрабіць палітінфармацыю. Яна махнула на гэта рукой і не выканала даручэнне сваіх таварышаў.*

*...што некаторыя людзі хварэюць на цікаўнасць. Не пазбаулены гэтай хваробы і студэнткі I курса філалагічнага факультэта (аддзяленне беларускай мовы і літаратуры) Наташа Палуян і Ніна Андрушкэвіч, якія адкрываюць і чытаюць пісьмы Пехцерава. Як бачна, гэта ужо навейшая ступень хваробы.*

Спартыўная старонка Беларускага універсітэта

## Міжфакультэцкія спаборніцтвы

Закончыліся камандныя спаборніцтвы па плаванню і фехтаванню, якія ўваходзяць у праграму круглагадовай спартакіяды.

Першае месца па фехтаванню і плаванню заняла каманда геолага-геаграфічнага факультэта. Другое месца па фехтаванню заняў гістарычны факультэт, а па плаванню—хімічны. У ходзе спаборніцтваў па плаванню геолага-геаграфічнага факультэта В. Пісарчык устанавіў новы рэкорд універсітэта у заплыве на 100 метраў спосабам брас. Яго час 1:19:09.

Трэба указаць на безадказныя адносіны да спаборніцтваў з боку спартыўных бюро ДСТ «Буравеснік» філалагічнага і біялагічнага факультэтаў. Філолагі не змаглі выставіць каманду плаўцоў, а біёлагі—фехтавальшчыкаў.

*М. НІКАЛАЕЎ*

## У СЕКЦЫІ ЛЁГКАЙ АТЛЕТЫКІ

Сонца хілілася к захаду. Яго промні падалі толькі на верхнія рады усходняй трыбуны стадыёна. А там, на бегавой дарожцы і ля ніжніх радоў трыбун, яшчэ ляжаў снег.

Сёння сюды прышлі на трэніроўку спартсмены універсітэта.

— Ой, дзяўчаткі, холадна неяк,—паціскаючы плячыма і паціраючы рукі, гаварыла невысокая жвавая дзяўчына, як толькі выйшлі з раздзявалкі.

— Нічога, нічога, прывыкайце. Зараз горача будзе,—падбадзёрыў іх Уладзімір Грыгоравіч Кушнароў.

І сапраўды, пасля дваццацімінутнай размінкі спартсмены ужо не адчувалі холаду. На іх расчырванелых тварах была свежасць, бадзёрасць.

— Не спяшайся, не спяшайся, Зоя... Вось так... Малайчына,—гаворыць трэнер чарнявай дзяўчыне ў сінім світары. І тая адразу-ж пераходзіць на роўны, рытмічны бег.

— Добра, добра, Алік... Толькі бядро трэба выносіць крыху вышэй... Так... Добра.

Праўда, за зіму бегуны адвыклі ад бегавой дарожкі, а таму ім было неяк нязручна спачатку. Але у канцы трэніроўкі ужо прызвычаіліся і адчувалі сябе, як кажуць, на сваім месцы. У кожным руху бегуноў адчуваецца, што яны недарэмна працавалі ўсю зіму і цяпер знаходзяцца ў добран спартыўнай форме...

Моцны, згуртаваны калектыў секцыі лёгкай атлетыкі універсітэта. Тут рэгулярна праводзяцца сходы лёгкаатлетаў, дзе дэталёва разбіраецца тэхніка бегу лепшых спартсменаў. Члены секцыі робяць культпаходы ў тэатры і кіно. Гэта аб'ядноўвае калектыў у адзіную дружную сям'ю.

Па ініцыятыве бюро секцыі выпускаецца газета «Лёгкаатлёт універсітэта» (рэдактар тав. Абрамовіч). На яе старонках падводзяцца вынікі спаборніцтваў, суровай крытыцы падвяргаюцца спартсмены, якія прапускаюць трэніроўкі. Для лёгкаатлетаў часта дэманструюцца спецыяльныя кінофільмы. Усё гэта дапамагае спартсменам у іх тэхнічным і маральным росце.

З 20 сакавіка лёгкаатлеты перайшлі на пяціразовыя заняткі у тыдзень. Спартсменам прывіваецца навык да павышаных нагрузак. В. Г. Кушнароў распрацаваў графік трэніровак, улічваючы індывідуальныя якасці і магчымасці кожнага спартсмена.

На трэніроўках Уладзімір Грыгоравіч уважліва сочыць за кожным рухам спартсмена, заўважаючы, здавалася-б, самыя нязначныя дэталі. Трэнер ведае, што і на такія дэталі патрэбна звяртаць увагу. Спартсмены слушна адносяцца да яго заўваг, сур'ёзна ставяцца да кожнай трэніроўкі. І іх майстэрства расце.

Мінулы год прынёс многа поспехаў. Рэкорды універсітэта былі пабіты на ўсіх дыстанцыях. Рэкардсменамі сталі Валодзя Цíток, Лёня Увараў, а Валя Кіслік аднавіў рэкорды універсітэта на трох дыстанцыях: 800, 1000 і 1 500 м. Але найбольшы поспех выпаў на долю Ігара Дабралюбава. Мінулы год для яго быў годам вялікіх спартыўных перамог. На першай Усебеларускай спартакіядзе студэнтаў ён заняў першае месца па спартыўнай хадзьбе на 10.000 м. А на першынстве Савецкага Саюза па лёгкай атлетыцы ў Тбілісі ён выканаў норму майстра спорту СССР. Гэта падняло дух спартсменаў. Яны зразумелі, што кожны з іх можа дасягнуць такога-ж поспеху.

У гэтым сезоне лёгкаатлеты універсітэта павінны выступіць значна лепш. В. Кіслік, В. Цíток, З. Духоўская, А. Кійранен, А. Увараў і інш. знаходзяцца ў добрай спартыўнай форме. Атрымалі заданне выканаць першы разрад скараходы Аркадзіи Пранові і Іван Абрамовіч.

В. Г. Кушнарову радасна бачыць плады сваёй працы. І хто ведае, можа праз некалькі год яго вучні выйдуць на старт разам з мацнейшымі спартсменамі краіны, а магчыма і свету, і будуць змагацца за перамогу, як роўныя з роўнымі.

**Ул. СКАПА.**

# *Універсітэцкія спартсмены* РЫХТУЮЦЦА *да спартыўнага лета* ПА ПРАГРАМЕ СПАРТАКІЯДЫ

## Перад стартам спартыўнага сезону

Пад ласкавымі праменнямі вясенняга сонца хутка тае апошні снег. Яшчэ тыдзень-другі — і можна будзе з цесных і пыльных залаў выйсці на адкрытыя пляцоўкі, чаму заўсёды так радуюцца спартсмены. Але спартсмены універсітэта чамусьці не раздзяляюць гэтай агульнай радасці.

Будаўніцтва і абсталяванне спартыўнага гарадка і летняй баскетбольнай пляцоўкі ва універсітэце звязана з вялікімі цяжкасцямі, са значнымі затратамі грошай. Здавалася-б, што і пляцоўку, і спартыўны гарадок будуць захоўваць. Але не тут-та было! З першых-жа цёплых дзён неабходна было арганізаваць камсамольцаў і моладзь на расчыстку снегу. Камітэт камсамола не зрабіў гэтага. Самім-жа спартсменам гэта аказалася не па сіле.

Лёгкаатлеты рашылі пачаць трэніроўку на адкрытым паветры з 10 красавіка. Але бегавая дарожка заліта вадой. І невядома, ці высахне яна ў намечаны тэрмін без умяшання моладзі.

Летняя пляцоўка стала падобнай праходнаму двару. Сюды прыходзяць усе, каму толькі уздумаецца: і студэнты універсітэта, дзеці і юнакі з розных раёнаў горада. Многія з іх у брудным, грубым абутку лезуць на пляцоўку. Гэта, безумоўна, не можа не адбіцца на насцілу з дошак. Ён брудны, у некаторых месцах прагнівае. На пляцоўцы не адрамантавана агарожа. Зрабіць рамонт пляцоўкі і агарожы неабходна неадкладна.

### *Гэта ваша справа, тав. Новік!*

Многія лёгкаатлеты універсітэта, напрыклад, студэнт III курса аддзялення журналістыкі В. Макарэвіч, пакінулі секцыю па той простай прычыне, што ім далі па некалькі грамадскіх нагрузак. У В. Макарэвіча іх чатыры. Не можа сістэматычна займацца у секцыі адна з лепшых лёгкаатлетак М. Лаўрыновіч (геафак). Ёй-жа далі некалькі грамадскіх даручэнняў. Прапускае заняткі у секцыі лёгкаатлет Грусь (гістфак). У яго многа нагрузак. А колькі такіх здольных спартсменаў, як М. Лаўрыновіч, В. Макарэвіч, пакінулі наогул заняткі у секцыях. І у той-жа час значная частка студэнтаў наогул не мае ніякіх даручэнняў. Адказны за спартыўна-масавую работу ад камітэта камсамола тав. Новік ведае аб гэтых непарадках. Ён абяцаў нават заняцца гэтым пытаннем. Але далей абяцанняў справа не пайшла. А клапаціцца аб спартсменах—гэта ваша першаступенная справа, тав. Новік! Трэба, нарэшце, зразумець, што заняткі у секцыях—таксама грамадская справа, таксама нагрузка.

### *Пагаворым аб дысцыпліне*

Па раскладу 30 сакавіка—заняткі мужчынскай зборнай каманды універсітэта па валейболу. Але ў зале іграюць... усяго тры спартсмены. Дзе астатнія? Яны рашылі зрабіць сабе маленькі «выхадны». Наогул, такія «выхадныя» ў валейбалістаў вельмі частыя. Трэніруюцца валейбалісты ўжо доўгі час, часта выступаюць на спаборніцтвах. Аднак згуртаванага калектыва тут няма. Ігракі каманды часта спазняюцца на трэніроўкі, самавольна пакідаюць заняткі, не з'яўляюцца на спаборніцтвы. Гэта асабліва часта практыкуе студэнт Гусакоў. Вынікі трэніровак тут не асуджаюцца, прагульшчыкаў і парушальнікаў трэніровак не караюць. Не дзіўна таму,, што нашы валейбалісты часта праігрываюць.

Не ўсё добра і у секцыі навічкоў-баскетбалістаў. Напрыклад, студэнт хімічнага факультэта Астаповіч ходзіць на трэніроўкі толькі адзін раз з трох заняткаў у тыдзень. Як не дзіўна, але ўсё гэта ідзе міма членаў секцыі і трэнера тав. Анкуды.

Часта зрываюцца трэніроўкі футбалістаў, хаця тытул чэмпіёнаў ДСТ «Буравеснік» рэспублікі абавязвае іх да многага. Пракрадваецца сумненне, ці змогуць яны яго захаваць. А кафедра фізвыхавання не вельмі заклапочана становішчам, якое стварылася.

Летні спартыўны сезон—на парозе. Гэты сезон звязан з вялікімі спаборніцтвамі. У чэрвені адбудзецца Усебеларуская студэнцкая спартакіяда. Каб нашы спартсмены занялі у ёй ганаровае месца, патрэбна многае. У першую чаргу—неабходзен спартыўны інвентар на кафедры фізвыхавання. Няма шыповак і тапачак для лёгкаатлетаў, недастаткова мячоў і формы для спартсменаў. Думаецца, што аб усім гэтым і павінны падумаць на парозе спартыўнага лета прарэктар па адміністратыўна-гаспадарчай частцы т. Бярэзін, заг. кафедры фізвыхавання т. Маркаў і адказны за спартыўна-масавую работу ад камітэта камсамола Новік.

**Рэйдавая брыгада газеты «Беларускі універсітэт»**
**Г. КЛЯБАНАЎ, Г. КАЗЛЮК, В. КУЦЭНКА, С. ЛЯПЕСІН, В. ЛУКІН.**

## Лепш вывучаць тэорыю шахматнай ігры

Закончыліся ігры на асабістае першынство па шахматах. Першае і другое месцы раздзялілі першаразраднікі студэнт II курса юрыдычнага факультэта Уладзімір Дзяменцій і студэнт I курса аддзялення журналістыкі Юрый Новікаў, якія набралі па 9,5 ачкоў з 13 магчымых. Трэцяе месца заваяваў студэнт II курса фізмата Монід Стругач, які адстаў ад пераможцаў на поўачка. На чацвертым—Смальянаў, 5—6 месцы раздзялілі паміж сабой Груды і Наумовіч.

Прайшоўшае першынство паказала, што ва універсітэце маюцца здольныя шахматысты, якія пры упорнай рабоце над сабой могуць дабіцца добрых вынікаў у рэспубліканскіх спаборніцтвах.

Аднак яно выявіла і недахопы у гульні многіх удзельнікаў. Перш за ўсё да гэтых недахопаў адносіцца слабае веданне тэорыі. Нават некаторыя вядучыя шахматысты ужо у пачатку партыі пападалі у дрэннае становішча. Напрыклад, Смальянаў у партыі супраць Нікіфаровіча з першых-жа хадоў папаў у такую дрэнную пазіцыю, што ужо трэба было здацца на дзесятым ходзе.

Дрэнныя пазіцыі атрымліваў у пачатковай стадыі і першаразраднік Наумовіч. Што-ж датычыцца удзельнікаў, якія занялі месцы у сярэдзіне табліцы і ніжэй, то яны не былі знаёмы нават з элементарнымі тэарэтычнымі пачаткамі.

Другім буйным недахопам мацнейшых шахматыстаў універсітэта з'яўляецца адсутнасць турнірнай практыкі. Лепшым з удзельнікаў, якія не маюць I разраду, быў Грудо, які выканаў норму II разраду. Ён выдатна правёў першую палавіну турніра, але затым з-за адсутнасці вопыту не вытрымаў напружанасці і пацярпеў рад паражэнняў.

Тое-ж самае было з Наумовічам, Рудаком і іншымі удзельнікамі першынства. Таму неабходна часцей праводзіць спаборніцтвы з іншымі ВНУ г. Мінска.

Першынства прайшло арганізавана і выклікала вялікую цікавасць у студэнтаў універсітэта.

*Н. ЮРЫЕЎ.*

## ПАЛАЖЭННЕ
### АБ ЭСТАФЕЦЕ НА ПРЫЗ ГАЗЕТЫ „БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ“

Эстафета ставіць сваёй мэтай папулярызацыю лёгкай атлетыкі сярод студэнтаў, выяўленне мацнейшых бегуноў універсітэта для ўдзелу ў эстафеце на прыз газеты «Сталинская молодежь».

Эстафета праводзіцца 25 красавіка 1956 года ў 19 гадзін. Да ўдзелу ў ёй дапускаюцца каманды ўсіх факультэтаў. Кожны факультэт выстаўляе неабмежаваную колькасць каманд. Спартсмены без адпаведнай падрыхтоўкі і візы урача да спаборніцтваў не дапускаюцца.

Заяўкі на удзел у спаборніцтвах падаюцца на кафедру фізвыхавання да 20 красавіка 1956 года. У заяўку дазваляецца ўключаць не больш 4 запасных спартсменаў.

Каманда, якая заняла першае месца, ўзнагароджваецца пераходным прызам газеты «Беларускі універсітэт» і дыпломам першай ступені. Каманды, якія занялі 2 і 3 месцы, узнагароджваюцца дыпломамі адпаведных ступеней.

Маршрут эстафеты праходзіць унутры універсітэцкага двара. Перадача эстафеты сустрэчная. Даўжыня трасы эстафеты складае больш 6 кіламетраў. Эстафета складаецца з 12 этапаў—7 мужчынскіх і 5 жаночых.

*1-ы этап мужчыны—400 м.*

Ад варот біякорпуса да фізмата. Вакол фізмата па прамой да варот біякорпуса.

*2-і этап жанчыны—300 м.*

Ад варот біякорпуса да ўваходу ва універсітэцкі сквер, направа па малому кругу да варот біякорпуса.

*3-і этап мужчыны—600 м.*

Ад варот біякорпуса да корпуса «А», вакол хімкорпуса да цэнтральнай асфальтавай дарогі да варот біякорпуса.

*4-ы этап мужчыны—750 м.*

Ад варот біякорпуса, вакол фізмата і хімкорпуса, да варот біяфака.

*5-ы этап жанчыны—160 м.*

Ад варот біяфака па прамой да інтэрната (корпус «А»).

*6-ы этап мужчыны—1.100 м.*

Ад інтэрната (корпус «А»)злева вакол фізмата, хімкорпуса да універсітэцкага сквера, направа па скверу (малы круг) да варот біякорпуса.

*7-ы этап жанчыны—750 м.*

Ад варот біякорпуса, вакол фізмата і хімкорпуса, да варот біяфака.

*8-ы этап мужчыны—300 м.*

Ад варот біяфака да ўваходу ва універсітэцкі сквер, направа па скверу (малы круг) да варот біякорпуса.

*9-ы этап мужчыны—700 м.*

Ад варот оіякорпуса направа вакол фізмата па прамой да ўваходу ў сквер, направа па скверу (малы круг) да варот біякорпуса.

*10-ы этап жанчыны—400 м.*

Ад варот біякорпуса вакол фізмата па прамой, да варот біякорпуса.

*11-ы этап мужчыны—750 м*

Ад варот біяфака да фізмата, вакол фізмата і хімкорпуса, да цэнтральнай асфальтвай дарогі, налева да інтэрната (корпус «А»).

*12-ы этап жанчыны—160 м.*

Ад інтэрната па прамой да варот біяфака (фініш).

**Рэдактар А. ВОЛК.**

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, пакой 62, тэл. 2-07-19

АТ 02967 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 427. Тыраж 2000